**Г.М. Міхальчук**

# РАДАСЛОЎНАЯ НАЗВЫ
## (з гісторыі мікратапонімаў в. Навасёлкі Кобрынскага раёна)

Калі мы пішам на канверце адрас, то часта не задумваемся, чаму менавіта так называецца той ці іншы горад альбо вёска. А, між тым, у назвах адбілася сама маці-гісторыя, у іх – водбліскі пажараў і войнаў, што прашумелі над вяршалінамі палескіх лясоў, водгулле чалавечых трагедый. Даўно мінулі дні ліхалеццяў, але захоўвае іх у памяці народ – зберагае і даносіць нам у песнях, паданнях, мясцовых назвах.

Вёска Навасёлкі, што ў Кобрынскім раёне, упершыню згадваецца ў “Рэвізіі Кобрынскай эканоміі” 1563 г., якую склаў каралеўскі рэвізор Дзмітрый Сапега. З 1561 г. фіксуюцца як маёнтак Брэсцкага павета Вялікага Княства Літоўскага. У першай палове XVIII ст. Навасёлкі былі раздроблены на некалькі маёнткаў, якімі валодалі польскія паны. Яны запрасілі на пасяленне ўніятаў-манахаў ордэна базыліян, намаганнямі якіх у сярэдзіне XVII ст. быў пабудаваны кляштар. Пры кляштары працавала ўніяцкая школа – першая ў гісторыі Навасёлак, а таксама касцёл святога Міхаіла, у вёсцы былі паравы млын, вінакурня, скотны двор. З 1795 г. вёска ў складзе Расійскай імперыі, у 1886 г. у ёй налічвалася 50 двароў, 495 жыхароў, было размешчана валасное праўленне, працавала Міхайлаўская царква (захавалася да нашых дзён), у перапісных дакументах згадваюцца таксама вятрак і піцейны дом, шклозавод. Цікава адзначыць, што з 1890 г. Навасёлкі падзяляюцца на дзве часткі – так званыя вёску і сяло. Сяло ўтваралі невялікія пасёлкі Крупчыцы, Хамяняты, Валынцы, Бурды, Заграбы, Яшчукі (першае Навасёлкаўскае сельскае таварыства). Вёска складалася з пасёлкаў Заграбы, Дзехцяры, Пацелі (2-е Навасёлкаўскае таварыства). Паблізу гэтых паселішчаў былі яшчэ маёнткі-ўладанні У. Жыромскага, П. Валіцкай, Ю. Астрамецкага, А. Фядзюшкі, С. Сямашкі, Р. Анцуты, А. Баяроўскай, В. Мыслоўскага.

У гісторыю Навасёлкі ўвайшлі як цэнтр узброенага паўстання сялян Кобрынскага павета супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, якое адбылося 3–4 жніўня 1933 г. Паводле рашэння Брэсцкага акруговага камітэта КПЗБ на 4 жніўня быў прызначаны паход сялян у маёнтак паноў Малашэўскіх з патрабаваннем выдаць плату за палявыя работы. 3 жніўня па дарозе да месца збору ў в. Булькова сяляне разграмілі некалькі сядзіб асаднікаў у Вялікіх Радванічах, захапілі зброю і некалькі гадзін трымалі

ў асадзе паліцэйскі ўчастак у Навасёлках. Раніцай 4 жніўня паліцыя з падмацаваннем з Брэста разагнала сялян, павет быў абвешчаны на асадным становішчы, пачаліся аблавы, вобыскі, арышты. Арганізатары выступлення былі аддадзены пад ваенна-палявы суд. На абарону арыштаваных выступілі працоўныя Заходняй Беларусі, таму смяротны прысуд васьмі чалавекам быў заменены пажыццёвай катаргай, астатнія прысуджаныя да розных тэрмінаў зняволення. У памяць пра выступленне сялян у Навасёлках пастаўлены помнік, на будынку школы зроблены барэльеф.

Назва вёскі звязана з перасяленнем людзей на новае месца жыхарства – "пайсці на выселкі", г. зн. пасяліцца на новых землях. Верагодна, што больш старажытнае паселішча існавала прыкладна за 2 км на поўнач ад сучасных Навасёлак. Менавіта там знаходзілі рэшткі глінянага посуду, прылады працы, манеты і інш., а ў 1970–90-я гады было адшукана некалькі дзесяткаў каменных сякер, церніц, бранзалетаў эпохі каменю і бронзы. Знаходкі гэтыя захоўваюцца ў школьным гісторыка-краязнаўчым музеі.

Ёсць і яшчэ адно меркаванне, нібыта назва вёскі пайшла ад прозвішча паноў Навасельскіх. Аднак гістарычнымі дакументамі гэта не пацвярджаецца.

Старажытныя пісьмовыя крыніцы часта згадваюць "Навасёлкі на Боне". Калісьці ў ваколіцах працякалі невялікія рачулкі Трасцяніца і Кобрынка, што ўпадалі ў р. Мухавец. У 1540 г. па тэрыторыі Кобрыншчыны прайшоў канал каралевы Боны – першы вядомы на Беларусі меліярацыйны аб'ект. Гэты канал і сёння дзейнічае непадалёк ад Навасёлак.

Шмат цікавых назваў маюць і мясцовыя ўрочышчы – нівы, палеткі, забалаці, рэчкі і руча, лясныя мясціны. Бадай ці не самым пашыраным тыпам мікранамінацый з'яўляюцца назвы ад уласных імёнаў, звычайна гаспадароў былых надзелаў, удзельнікаў пэўных падзей і інш. Гэта такія назвы, як *Брышчы* (прозвішча Брышч), *Бурак* (Бурак), *Бурдыноўка* (Бурда), *Бурды*, *Васілец* (Васіль), *Гаратына* (Гаратын), *Грынькова* (Грынько), *Галоўська* (Галоўська), *Даманыўка* (Даманыч) і інш.

Другую групу складаюць назвы, звязаныя з характарыстыкай мясцовасці: *Астраўкі*, *Астрыўцы*, *Выгары*, *Выпалянка*, *Высокае*, *Верхнікі*, *Галя*, *Гніліца*, *Гнілое*, *Горы*, *Кар'еры*, *Міжылішча*, *Міжэмхі*, *Пустое*, *Сухавыі*, *Сухавыршча*, *Ямы*.

Некаторыя мікратапонімы паходзяць ад назвы мясцовасці, з якой мяжуе ўрочышча: *Быляншчына, Верхалёшчанка, Ляхчыцкія горы, Падзабава*.

Ёсць група іншамоўных назваў: *Джар, Угла, Урля, Ульнік*.

Выдзяляюцца мікратапонімы, у аснове якіх назвы дрэў і раслін, жывёлаў, птушак і рыб: *Асінкі, Асіннік, Берасцянка, Бярэзіна, Гай, Дубішча, Корча, Крапіўка, Ліпка, Луг, Сасонка, Соснаў Груд, Юлкі, Яблынька, Ясень, Арол, Бараны, Галубіўшчына, Катовыя Лапы, Кіззе, Кабылле, Рак, Лісіца, Ляшчанец*.

Асобную групу складаюць словы, у аснове назваў якіх выяўляюцца памер ці форма аб’екта: *Вялікае Стойла, Доўгае, Доўгі Брод, Доўгі Край, Доўгі Лясок, Круглiца*.

Намі зафіксаваны дзве назвы, звязаныя з аб’ектамі, якія былі на гэтым месцы раней: *Маяк, Палігон*.

Мікратапонімы *Бараны, Дзёгаць, Мёртвае, Патопнік, Пагарэлае, Панылі* звязаны з пэўнымі здарэннямі ў рэальным жыцці; з гістарычнымі легендамі і паданнямі асацыіруюцца назвы *Княжна гара* і *Зайчык*. Пры дапамозе прыставак ад назваў блізкіх урочышчаў утварыліся мікратапонімы *Забрады, Забона, Загай, Закоршунава, Зарэчка, Запалануха, Закобрынка, Падвыгары, Падвяжышча, Падгор’е, Падкняжная, Падкобрынка, Падкабылле, Падрыпахіўка*.

Назвы хутка страчваюць сваю матываванасць. Мяняюцца гаспадары ўрочышчаў, пачынаюць забывацца розныя здарэнні, пастунова становячыся казкамі і легендамі, магутныя старажытныя лясы ператвараюцца ў балоты, на месцы бясконцых палёў вырастаюць бярэзнікі, асіннікі, дубравы. Усё мяняецца. Застаюцца імёны, хаваючы ў сабе таямніцы нашай гісторыі…

**Н.С. Міціловіч**

## ТЭМАТЫЧНАЯ ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ЛЕКСІКІ НА ПАЧАТКУ ХХ СТ.

Наяўнасць больш ці менш выразнай тэматычнай дыферэнцыяцыі з'яўляецца важным паказчыкам ступені развітасці пэўнай лексіка-семантычнай групы, зыходзячы з чаго ў сваю чаргу можна рабіць вывады аб узроўні агульнага моўнага развіцця на пэўным гістарычным этапе.